ў «Праграме па фальклору і міфалогіі», створанай навукоўцамі Акадэміі навук Беларусі. Такі ж прынцып рэалізаваны на факультэце завочнага навучання Беларускага універсітэта культуры.

Вырашэнне ўказаных пытанняў дазволіць хоць бы часткова вырашыць праблему стварэння лагічнай праграмы выкладання беларусазнаўчых дысцыплін і асновы для далейшай работы спецыяльных кафедраў на падрыхтоўцы спецыялістаў у залежнасці ад профілю іх будучай прафесіі.

Мархоцкі Я.Л.,
прафесар

## АБ УДАСКАНАЛЕННІ МЕТОДЫКІ НАВУЧАННЯ І ВЫХАВАННЯ СТУДЭНТАЎ

Ва ўмовах пераходу да шматузроўневай сістэмы адукацыі ў галіне культуры і мастацтва ўзрастае роля выкладчыка ва ўдасканаленні методыкі навучання і выхавання студэнтаў.

Найбольш інтэнсіўна здзяйсняецца фарміраванне светапогляду ў студэнцкія гады, калі засвойваецца вялікі паток інфармацыі, закладваюцца асновы будучай прафесіі. У гэтай сувязі лічым, што методыка ўдасканалення навучання і выхавання павінна быць комплекснай.

Навучанне і выхаванне студэнтаў, безумоўна, павінна весціся на высокім прафесійным узроўні. Але, акрамя гэтага, вялікае значэнне маюць якасці педагога. Гэта перш за ўсе гуманныя адносіны да людзей, сумленнасць, праўдзівасць, сціпласць, непрымірымыя адносіны да ілжывасці, несумленнасці, недысцыплінаванасці.

Пры выпрацоўцы маральных якасцей і ідэйнай перакананасці студэнтаў ў працэсе навучання неабходна памятаць, што перакананасць не з'яўляецца вынікам пасіўнага ўспрымання, а прадвызначае актыўнае стаўленне студэнта да маральных прынцыпаў, спосабу паводзін. Вялікая роля ў гэтым выкладчыка, уся дзейнасць якога павінна сведчыць аб тым, што прынцыпы, ідэалы, якія ён імкнецца выхоўваць у студэнтаў, маюцца ў яго самога.

Навучаючы і выхоўваючы студэнтаў, патрэбна зыходзіць з таго, што сучасныя студэнты будуць не толькі спецыялістамі ў галіне сваёй прафесіі, але і кіраўнікамі ўстаноў, арганізатарамі, прадпрымальнікамі і грамадскімі дзеячамі. Таму важна выхоўваць іх працаздольнымі і працалюбівымі.

Вялікая роля ў гэтым накірунку адводзіцца індывідуальнай рабоце. Яна стварае даверлівыя адносіны паміж выкладчыкам і студэнтам, дазваляе аказаць дапамогу студэнту ў выбары правільнага вырашэння нават у асабістых пытаннях.

Ідэйная перакананасць выкладчыка, высокія маральныя якасці, веды і правільнае выкарыстанне законаў і катэгорый філасофіі, уменне добра арганізаваць працу садзейнічаюць духоўнаму збліжэнню настаўніка і вучняў, дазваляюць студэнтам ацэньваць падзеі і факты нашага жыцця, часовыя цяжкасці ў ім. Адначасова выкладчык павінен улічваць асаблівасці складваючагася калектыву групы і курса, псіхалагічныя, інтэлектуальныя і палавыя асаблівасці студэнтаў.

Душу народа можна пазнаць толькі праз знаёмства з яго культурай і гісторыяй. Неабходна беражліва захоўваць і развіваць мову, культуру, народныя традыцыі беларускага народа. Таму выкладанне матэрыялу дысцыплін трэба цесна звязваць з прапагандай беларускіх народных традыцый у розных галінах жыцця, падкрэсліваць ролю выдатных прадстаўнікоў беларускага народа ў развіцці мастацтва, навукі, культуры сваёй краіны.

Кудрыцкі У.І.,
дацэнт

## АСАБЛІВАСЦІ ПРАВЯДЗЕННЯ ЗАНЯТКАЎ У СПЕЦМЕДГРУПАХ ВА ЎМОВАХ БЕЛАРУСКАГА УНІВЕРСІТЭТА КУЛЬТУРЫ

Методыка заняткаў па фізвыхаванню ў спецмедгрупах пры розных захворваннях шырока асвятляецца ў навуковай і метадычнай літаратуры. Але пытанні іх арганізацыі асвятляюцца недастаткова або падаюцца ў ідэальным класічным варыянце. У працэсе работы ў спецгрупах мы пераканаліся, што вырашыць пытанні арганізацыі груп, камплектавання іх у адпаведнасці з дыягназам захворвання, узростам, полам, фізічнай падрыхтоўкай цяжка заза адсутнасці ў вышэйшых установах дастатковай матэрыяльнай базы, аўдыторнага фонду, фонду заработнай платы. Уплывае тут і спецыфіка раскладу заняткаў і інш. Таму мы вырашылі, зыходзячы з умоў нашага універсітэта, распрацаваць уніфікаваную методыку заняткаў па фізвыхаванню ў спецмедгрупах з мэтай умацавання здароўя хворых студэнтаў і стабілізацыі працэсаў хранічных захворванняў.

Дзеля гэтага распрацавалі рабочы план на навучальны год. Тэарэтычны раздзел плана ўключае прыродазнаўча-навуковыя асновы фізічнага выхавання; урачэбны кантроль і самакантроль; рэжым дня і харчаванне. Практычны раздзел прадугледжвае агульнае ўмацаванне арганізма;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ